**Заданні да конкурсу “Знак таленту”**
**24.04.2025**

**Тэма: “Драматургічная спадчына Янкі Купалы”**

**Заданне 1**

**Паглядзіце на фотаздымкі і малюнкі. Адкажыце на пытанні да іх.**

**1.** Які аб’ект на фотаздымку? Запішыце, у якіх населеных пунктах знаходзіцца ён і чатыры яго філіялы.








**2.** На фотаздымках ніжэй зборнікі Янкі Купалы. Запішыце іх назвы і гады выдання.

А) 

Б) 

В) 


**3.** Чаму Янку Купалу было адмоўлена ў працы пісарам ў Радашкавічах? Ён пратрымаўся на гэтай працы толькі два тыдні і атрымаў разлік.



**4.** Каму належаў гэты герб?.



**5. Машынай якой маркі валодаў і кіраваў Янка Купала?**



**6. Хто на фотаздымках і якую ролю ў жыцці Я.Купалы адыгралі гэтыя людзі?**

**А)**  **Б)**  **В)** 

**7. Паглядзіце на музейную інсталяцыю. Што яна сімвалізуе?**



**Заданне 2.**

**Частка А. Суаднясіце словы з персанажамі, якім яны належаць.**

| | |
|---|---|
| **1.** “Меджду протчым” | **А.** Сцяпан Крыніцкі |
| **2.** “Кахаценькая, родненькая”, “дзве дзюркі ў носе і скапчылося” | **Б.** Адольф Быкоўскі |
| **3.** Пане дабрадзею”, “Собственно, вось-цо-да” | **В.** Мікіта Зносак |
| **4.** “Тудэма-сюдэма” | **Г.** Пранцісь Пустарэвіч |
| **5.** “Фі, мужыцкая!” | **Д.** Агата Пустарэвіч |

**Частка Б. Патлумачце значэнне гаваркіх прозвішчаў у п’есах Янкі Купалы**

| | |
|---|---|
| **1. Янка Здольнік** | |
| **2. Мікіта Зносак** | |
| **3. Наста Пабягунская** | |
| **4. Генрых Мотавіч Спічыні** | |
| **5. Лявон Зяблік** | |
| **6. Якім Сарока** | |
| **7. Пранцісь Пустарэвіч** | |

**Частка В. Суаднясіце фразеалагізмы з п’ес Янкі Купалы з іх значэннямі.**

| | |
|---|---|
| **1. “***папаў у нерат, што ні ўзад ні ў перад”* | **А.** кінуцца на ўцёкі |
| **2. “***выйшла з яго ні Богу свечка, ні чорту качарга”* | **Б.** марна траціць час за размовамі |
| **3.** “Ці ж я ўжо такі, *без усіх клёпак у галаве…*” | **В.** ‘не падаць выгляду’ |
| **4.** “каб толькі папусцілася, дык *з’еў бы мяне і не аблізаўся б* нават” | **Г.** невядома што, незразумелае |
| **5.** “Дурню плюнь у вочы, а ён скажа: дэждж ідзе” | **Д.** ні аб чым не думаючы |
| **6.** “гэта я з перапугу *задаў так лататы*” | **Е.** складаная, безвыходная сітуацыя |
| **7.** “На той [скрыпцы] гудзеў як авадзень, і на гэтай таксама выводзіш нейкае *паўтара людскога*” | **Ё.** пасрэдны, ні да чаго не здатны |
| **8.** “*…спіць, як апошняе ў печ усыпаўшы*” | **Ж.** дзівакаваты, ненармальны |
| **9.** “лепей, чымся *з пустога ў парожняе пералівань*” | **З.** легкавернасць ад недасведчаннасці |

**Заданне 3**

**Адкажыце на пытанні.**

1. Як называецца страшная зброя, якую "прыдумаў сам Люцыпар" і якой баяцца ўсе жанатыя мужчыны?
2. "Таўкачыкі", "Лявоніха", "Цыганка" , "Мяцеліца", "Мікіта" – што гэта?
3. Хто такія "прымакі"?
4. Запішыце, калі і дзе адбыліся ці адбываюцца пастаноўкі спектакляў:

| | |
|---|---|
| А) "Прымакі" | |
| Б) "Паўлінка" | |
| В) "Тутэйшыя" | |
| Г) "Раскіданае гняздо" | |

5. Навукоўцы гавораць, што драма Янкі Купалы "Раскіданае гняздо" мае некалькі ўзроўняў прачытання: аўтабіяграфічны, нацыянальны, універсальны. Растлумачце кожны з іх.

| | |
|---|---|
| А) аўтабіяграфічны | |
| Б) нацыянальны | |
| В) універсальны | |

6. У п'есе "Раскіданае гняздо" збіраецца "вялікі Сход". Па што яго збіраюць?
7. Аб якім творы Янка Купала скажа наступнае: "Я памру, а "…" займе яшчэ на сцэне сваё пачэснае месца і загаворыць на поўны голас. Я ўклаў у гэтую п'есу лепшае, што было ў маёй паэзіі і прозе"?
8. Растлумачце "феномен тутэйшасці". Як да яго адносіўся Янка Купала?
9. У які гістарычны перыяд адбываюцца падзеі п'есы "Тутэйшыя"? Якая палітычная сітуацыя была характэрнай для гэтага перыяду?
10. Запішыце жанравае вызначэнне п'ес:

| | |
|---|---|
| А) "Прымакі" | |
| Б) "Паўлінка" | |
| В) "Тутэйшыя" | |
| Г) "Раскіданае гняздо" | |

**Заданне 4.**

**Частка А. Запішыце імёны "парачак", дыялогі якіх прыведзены ніжэй.**

| | |
|---|---|
| **1.** – *(садзячыся на услончыку)*. Ну, а як … гадуецца?<br>– Як, …, бачыце! Жыву апошнія часы на свеце і свету не бачу. Адна мая радасць, адно мае шчасце, калі з та... калі ўночы сны цудоўныя бачу, калі думкамі плыву к та... к свайму месячыку яснаму… | |
| **2.** – Ды ўсё аб тым самым, меджду протчым, хэрувімская мамзэль ...: аб вас мае думы ўпалі ў глыбокую задуму.<br>– І глупства робяць гэтыя вашы думы. Я ж вам ужо цяперся забараніла думаць аба мне, пакуль не зробіцеся асэсарам! Значыцца, і не маеце права думаць.<br>– Не магу вытрываць, сэрафімская, меджду протчым, | |

| | |
|---|---|
| мамзэль …, аніяк не магу вытрываць! (*Становіцца на лаўцы перад ... на калені, засланяючы збольшага яе й сябе распушчаным парасонам.*) Мадоністая мамзэль …! Каханне маё, медждý протчым, вульканічнае! Падаруйце ж мне, нарэшце, сваю абымальную руку і сваё трапятлівае сэрца. | |
| **3.** – Гэта ты, як пятух, а я, як...<br>– *(перапыняючы)*. Як курыца.<br>– Не курыца, а як зязюлька. | |
| **4.** – Узялі ды паміж сабой пажаніліся. Цяпер яна мая жонка назаўсёды.<br>– І ён таксама — мой муж, але ці назаўсёды — яшчэ паваражу. | |
| **5.** – Да … ў госці прыйшоў і... гарэлачкі прынёс! *(Паказваючы паўквартоўку.)* Во!<br>– А за гэта сухой лазні не дастанеш ад мамкі і таткі?<br>– Гэта толькі татка сягоння дастане ад мамкі лазні, бо дома не начаваў. | |
| **6.** – А ці, пан …, жаніцца хочаце?<br>– Ой, страшэнна хачу. А панне … замуж хочацца?<br>– Ого, яшчэ і як хочацца!.. Калі ўдасца, дык яшчэ і сягоння, можа, пайду. | |
| **7.** – Ужо я раздумалася — не пайду тапіцца: вада яшчэ такая халодная.<br>– І я ўжо раздумаўся — не пайду вешацца: дзяга яшчэ парвецца. | |

**Частка Б. Запішыце імёны персанажаў, чые жыццёвыя прынцыпы адлюстраваны ў наступных словах.**

| | |
|---|---|
| **1.** “Няхай сабе кажуць, што я дурнаваты, што я такі, што я гэтакі, але я ўсё бачу і усе разумею. Не хачу толькі наверх вылазіць з сваім розумам, бо з ім цяперашнім светам далека не зойдзеш.” | |
| **2.** “Цэлы свет — хата мая, усе людзі — радня мая, уся зямелька — поле мае роднае.”<br>“Ні над чым не трасуся, нічога бараніць не маю: усе багацце са мною ў гэтых торбах.” | |
| **3.** “Каб гэтага не было, мы павінны растаптаць, зніштожыць даўгавечную ману, якая вучыць, што мы не ёсць мы, што мы нейкае нешта, якое абы накарміў, як быдлё, дык і сыта будзе. Мы павінны душу нашу народную выявіць у сваім «я», у сваёй самабытнасці і смела сягнуць па сваё неадымнае права самім распараджацца гэтым сваім «я».” | |
| **4.** “Які я ўжо ўдаўся, такі і буду, а свайго ў крыўду не папушчу, хоць бы там свет дагары нагамі перакуліўся.” | |

| | |
|---|---|
| **5.** “Чалавек з зямлёй зрастаецца, як гэта дрэва: ссячы дрэўца — засохне, адбяры ў чалавека зямлю — згіне.”<br>“Трэба праўды шукаць не тапаром, а розумам.” | |
| **6. “**Можна мець светагляд адзін, думаць другое, гаварыць трэцяе, а рабіць чацвертае…” | |
| **7.** “Я ратаваць усіх вас хачу, хоць мо і гіну сама.”<br>“Я толькі хачу гэта няшчасце на шчасце змяніць.” “Гэтак і ўсю сваю моладасць пачаканкамі перачакаем. А так гэта дачэснае жыццё можна добра наладзіць, так добра, абы толькі ахвота ў нас была ды вытрываласць.” | |
| **8. “** Вось мы з табой, міленькая, такім парадкам самі сабе шчасце збудуем і нічыёй ласкі прасіць не будзем.” | |
| **9.** “Гэтак ужо Богам устроена на свеце. Нічога не парадзіш.”<br>“…усе як ёсць рана-позна ўміралі, уміраюць і ўміраць будуць. Такая ўжо воля боская.” , “…пакарыся ты ім, — яшчэ не позна!” | |
| **10.** “я не выжыву з сораму, людзі вочы выберуць, нельга будзе на свет паказацца.”, “Зломак - не зломак, але і за ламаку не пайду.” | |

## Заданне 5

**Паглядзіце ўрыўкі са спектакляў і адкажыце на пытанні да іх.**

1. За што бацька злуецца на Паўлінку? Дайце разгорнуты адказ.
2. Дзеля чаго, на вашу думку, аўтарам быў уведзены вобраз Незнаёмага? Што ён сімвалізуе?
3. Што сабой сімвалізуюць вобразы Усходняга і Заходняга вучоных у п’есе “Тутэйшыя”?